Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

DOI:10.17951/sb.2022.16.143-157
Studia Białorutenistyczne 16/2022 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Aksana Danilchyk / Аксана Данільчык

Independent Researcher (Belarus)
e-mail: aksana.minsk@gmail.com
https://orcid.org/0000-0002-1561-588X

Аўтарскія стратэгіі ў беларускай і італьянскай жаночай паэзіі міжваеннага перыяду (Наталля Арсеннева, Яўгенія Пфляўмбаўм, Антонія Поццы)

Author's Strategies in Belarusian and Italian Women's Poetry of the Interwar Period (Natallia Arsiennieva, Jaughenia Pflaumbaum, Antonia Pozzi)

Autorskie strategie w białoruskiej i włoskiej poezji kobiecej okresu międzywojennego (Natalla Arsienniewa, Jaugenia Pflaumbaum, Antonia Pozzi)

Abstract

The article deals with the problem of the author's strategies on the example of Belarusian and Italian women's poetry of the interwar period, in particular, Belarusian poetesses Natallia Arsiennieva, Jaughenia Pflaumbaum and Italian poetess Antonia Pozzi. There are several common themes in their works11: beauty /magnificence, creativity/ of the poetry, nature and its close connection with the emotional state of the lyrical character, as well as distancing from social motives. The article examines how the authorial strategies of poetesses changed during this period.

Keywords: authors' strategies, introspection, expressionism, Belarusian poetry, Italian poetry

Abstrakt

Artykuł podejmuje problem strategii autorskich na przykładzie białoruskiej i włoskiej poezji kobiecej okresu międzywojennego, w szczególności białoruskich poetek Natalii Arsienniewej, Jewgienii Pflaumbaum i włoskiej poetki Antonii Pozzi. W ich twórczości można wyodrębnić kilka wspólnych tematów: piękno/wspaniałość, twórczości/poezji, natury i jej ścisłego związku ze stanem emocjonalnym lirycznej bohaterki, a także dystansowanie się od motywów społecznych. W artykule analizuje się, jak w tym okresie zmieniały się autorskie strategie poetek.

Słowa kluczowe: strategie autorskie, introspekcja, ekspresjonizm, poezja białoruska, poezja włoska

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

Анатацыя

У артыкуле разглядаецца праблема аўтарскіх стратэгій на прыкладзе беларускай і італьянскай жаночай паэзіі міжваеннага перыяду, у прыватнасці беларускіх паэтак Наталлі Арсенневай, Яўгеніі Пфляўмбаўм і італьянскай паэткі Антоніі Поццы. У іх творчасці можна выдзеліць некалькі агульных тэмаў: красы / хараства, творчасці / паэзіі, прыроды і яе цеснай сувязі з эмацыйным станам лірычнай гераіні, а таксама дыстанцыянаванне ад сацыяльных матываў. У артыкуле даследуецца, якім чынам змяняліся аўтарскія стратэгіі паэтак на працягу дадзенага перыяду.

Ключавыя словы: аўтарскія стратэгіі, інтраспекцыя, экспрэсіянізм, беларуская паэзія, італьянская паэзія

Праблема аўтарскіх стратэгій займае значнае месца ў літаратуразнаўчых даследаваннях апошніх гадоў. Неабходнасць аналізу і сістэматызацыі разнастайных формаў існавання аўтара ў соцыуме і ў творчым асяроддзі, рэалізацыі творчага патэнцыялу пісьменніка, яго лірычнага „я", узаемадзеяння з чытачом вымагаюць на сучасным этапе новых падыходаў найперш у сувязі са зменай сацыякультурнай сітуацыі ў камунікатыўнай прасторы і з'яўляюцца прадуктыўнымі не толькі ў дачыненні да актуальнай літаратурнай сітуацыі, але і ў дыяхранічным аспекце. Пры гэтым, як адзначаюць літаратуразнаўцы, тэрмін „аўтарскія стратэгіі ў літаратуры" не мае пакуль устойлівага азначэння, зафіксаванага ў энцыклапедычных і даведанікавых выданнях (Prozorov, 2021, s. 180). Наталля Юрына прапануе разумець пад аўтарскай стратэгіяй „сукупнасць камунікатыўных установак, якія вызначаюць спосабы выяўлення аўтарскай свядомасці і спецыфіку арганізацыі дыялога з чытачом... У адпаведнасці з імі аўтар займае пэўнае становішча ў адносінах да аб'екта маўлення і адрасата, што выяўляецца праз адпаведны характар прапанаванай інфармацыі (выбар тэмы, паўната яе раскрыцця, сэнсавыя акцэнты), а таксама праз выкарыстанне магчымасцяў пэўнай жанравай формы, стылю, тэмпу і спосабу выкладання, арганізацыю маўленчага акту"[1] (Ûrina, 2020, s. 74).

Як бачым, праблема аўтарскай стратэгіі закранае шмат аспектаў творчага працэсу і звязана найперш з праблемай выбару (свядомага ці неўсвядомленага) мастацкіх сродкаў, якая ў пэўныя гістарычныя моманты робіцца надзвычай вострай. Такім момантам можна лічыць і перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі, складаны як з геапалітычнага, так і з сацыяльнага пункту гледжання час. Беларуская літаратура ў гэты перыяд прадстаўлена дзвюма асяроддзямі: заходнебеларускім і ўсходнебеларускім, прычым і ў першым, і ў другім выпадку паэтычнае слова актыўна выкарыстоўвалася для дасягненні пэўных сацыяльна-палітычных мэтаў: або для барацьбы за нацыянальнае вызваленне,

[1] Тут і далей пераклад назваў твораў і цытат аўтара артыкула.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

або для пабудовы сацыялістычнага грамадства, што прадвызначала запатрабаванасць мастацкіх тэкстаў адпаведнай тэматыкі.

Асаблівую цікавасць для нас ўяўляюць аўтарскія стратэгіі ў жаночай паэзіі, паколькі менавіта дадзены перыяд у беларускай літаратуры характарызуецца яе колькасным і якасным ростам, і, акрамя таго, бадай, толькі ў Савецкай Беларусі мела месца спроба, хоць і ў большай ступені дэкларатыўная, стварыць спрыяльныя ўмовы для творчай рэалізацыі жанчын. У той жа час у БССР назіраецца паступовае узмацненне таталітарных тэндэнцый і, як вынік, спачатку звужэнне поля аўтарскіх стратэгій у выбары мастацкіх сродкаў, а пасля іх паступовае замяшчэнне адзіна магчымай – афіцыйнай, якая прадугледжвала поўнае падпарадкаванне мастацкай творчасці эстэтызацыі сацыялістычных пераўтварэнняў.

У Італіі з пачатку 1920–х гадоў усталяваўся таталітарны рэжым Мусаліні з захадамі па стварэнню адпаведнай эстэтыкі. Ханс Гюнтэр адзначае: „Думка пра таталітарную дзяржаву як пра твор мастацтва справядлівая не толькі ў адносінах да Трэцяга Рэйху, але і да Савецкага Саюза часоў сталінізму, а таксама да фашысцкай Італіі. Яна нараджаецца з асноўнай тэндэнцыі гэтага тыпу культуры – з імкнення да гвалтоўнай гарманізацыі ўсіх сфер жыцця, з вымушанай гарманічнай цэласнасці ўсіх яе частак. Але паколькі жыццёвую рэальнасць гвалтоўна нельга прывесці да гармоніі, намаганні пераносяцца на стварэнне цудоўнай бачнасці, г. зн. эстэтычнымі сродкамі ствараецца ілюзія гарманічнага адзінства. Гэта стала магчымым толькі ў эпоху росквіту тэхнікі і сродкаў масавай камунікацыі, якія прасякнулі ў XX стагоддзі ўсе сферы жыцця" (Gûnter, 2000, s. 7). Аднак у італьянскай культуры цэнзура не была настолькі жорсткай і ў любым выпадку пакідала магчымасці для паэтычнай творчасці па-за межамі афіцыйнай культуры.

Што датычыцца італьянскай жаночай паэзіі, то італьянскія аўткаркі сталі актыўна заяўляць пра сябе з пачатку XX стагоддзя, хоць Італія мае традыцыю жаночага пісьма, якая ўзыходзіць да часоў Адраджэння. Аднак у 20–30-я гг. XX ст. жаночая літаратурная ды іншая творчасць адкідаецца на перыферыю мастацкага жыцця краіны, мае месца яе выразная маргіналізацыя, прычым на ўсіх узроўнях – ад самога Дучэ – Мусаліні – да шараговых членаў фашысцкай партыі. Гэтую сітуацыю прааналізавала на прыкладзе жанчын-мастачак Сабрыны Спінаццэ ў артыкуле *Жанчыны і мастацкая дзейнасць пад час фашысцкага дваццаігоддзя* (Spinazzè, 2001, s. 121–136) і прыйшла да высновы, што нават жаночыя мастацкія аб'яднанні служылі стварэнню ілюзіі ўлады жанчын у мастацкім асяроддзі, а не іх творчай рэлізацыі.

Для разгляду аўтарскіх стратэгій жаночай паэтычнай творчасці, мы спынілі ўвагу на трох аўтарках: беларускіх паэтках Наталлі Арсенневай (1903–1997), Яўгеніі Пфляўмбаўм (1908–1996) і італьянскай паэтцы Антоніі Поццы (Antonia Pozzi, 1912–1938). Іх літаратурная актыўнасць прыпадае на прыкладна адзін час, ці, прынамсі, перасякаецца ў часе. Дзве з названых аўтарак – Яўгенія Пфляўмбаўм і Антонія Поццы – жылі і стваралі ва ўмовах таталітарнай дзяржавы або ва ўмовах

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

яе станаўлення, але іх мастацкія практыкі разыходзіліся з агульнапрынятымі тэндэнцыямі, яны здолелі стварыць уласны мастацка-паэтычны свет у пэўнай ступені незалежны ад сацыяльнага кантэксту іх існавання, вядома, з пэўнымі адметнасцямі, характэрнымі для кожнай з іх. Але агульным можна лічыць цесную сувязь света прыроды з пачуццямі лірычнай гераіні і мінімальную прысутнасць сацыяльных матываў (у Яўгеніі Пфляўмбаўм – да пэўнага моманту). Хоць „...на камунікатыўныя ўстаноўкі аўтара не могуць не ўплываць таксама і некаторыя экстралінгвістычныя катэгорыі – сацыяльная прыналежнасць, засвоеныя культурныя традыцыі, кола зносін, бытавыя абставіны, асаблівасці асобы, гісторыка-літаратурны кантэкст творчасці, характар узаемаадносінаў з паплечнікамі па пяры і публікай. Усе гэтыя фактары ў іх сукупнасці вызначаюць бягучыя аўтарскія мэты і задачы, якія ўлічваюцца пры стварэнні мастацкага цэлага твора і фарміруюць камунікатыўнае поле «аўтар – тэкст – чытач»” (Ûrina, 2020, s. 75). Аднак гэты ўплыў, зразумела, выяўляецца па-рознаму і ў рознай ступені. Што падаецца важным – у выпадку названых паэтак можна гаварыць пра інтэнцыю да гарманічнай цэласнасці ўнутранага свету лірычнага „я”. У гэтай сувязі ў іх творчасці можна выдзеліць некалькі агульных тэмаў: красы/хараства; творчасці/паэзіі; прыроды і яе цеснай сувязі з эмацыйным станам лірычнай гераіні. Пры гэтым не прасочваюцца агульныя знешнія фактары, якія б прадвызначалі прыярытэтнасць акрэсленых тэмаў.

Наталля Арсеннева – заходнебеларуская паэтка з даволі замкнёным ладам жыцця, без вышэйшай адукацыі, жонка афіцэра польскай арміі, па-сутнасці, хатняя гаспадыня, аднак, не зважаючы на палітычную незаангажаванасць яе паэзія ў міжваенны перыяд, запатрабаваная шматлікімі перыядычнымі выданнямі. „<…> Зыходзячы ў „мастацтва для нешматлікіх”, канцэнтруючы ў значнай ступені сваю ўвагу на прадмеце самога мастацтва, яна якраз і пісала творы высокага эстэтычнага ўзроўню і пакінула незвычайны духоўны пажытак, патрэбны ўсёй беларускай культуры на яе новым гістарычным вітку самаразвіцця” (Čykvìn, 2020b, s. 42) – гэтая выснова Яна Чыквіна пра творчасць Н. Арсенневай актуальная для ўсіх трох аўтарак (у выпадку Антоніі Поццы, зразумела, дастаткова замяніць азначэнне „беларускі” на „італьянскі”). У заходнебеларускай крытыцы адзначалася падкрэсленая адасобленасць паэзіі Н. Арсенневай ад агульных тэндэнцый, напрыклад, у 1937 годзе К. Бруевіч пісаў: „Грамадзскім матывам, пераважаючым у творчасці нашых паэтаў, іхняй бунтарнасці і магутным прызывам да барацьбы процістаўляе яна свой уласны паэтыцкі свет, свет чыстае красы” (Bruevìč, 1937, s. 33).

Антон Луцкевіч у рэцэнзіі на першы зборнік Н. Арсенневай *Пад сінім небам* (1927) вылучыў два асноўныя уплыва на творчасць паэткі – Янкі Купалы і Максіма Багдановіча, прычым заўважыў, што „як і Багдановіч, яна з малюнкамі прыроды заўсёды злучае той ці іншы глыбейшы настрой, тое ці іншае асабістае перажыванне, рэфлексію, думку-разважанне” (Luckievič, 2006, s. 227). Наконт уплыву Я. Купалы крытык адзначыў: „У Купалы навучылася Арсеннева карыстацца шматфарбнымі колерамі, рассыпанымі ўва ўсёй прыродзе… Купала

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

даў ёй і багата рытмікі… Урэшце, Купалавым уплывам трэ тлумачыць тую смеласць і размах, з якімі Арсеннева малюе запраўды ж мастацкія абразы прыроды" (Luckievič, 2006, s. 227). А. Луцкевіч выдзяляе яшчэ такі аспект як „жаноцтва" і праводзіць паралель з творчасцю Канстанцыі Буйло.

Наколькі творы Наталлі Арсенневай былі вядомыя ў БССР, ці маглі ўплываць на літаратурны працэс ва Ўсходняй Беларусі ўвогуле і, у прыватнасці, на творчасць Я. Пфляўмбаўм? Як вядома, у 1923 годзе ў Мінск пераехаў настаўнік паэткі ў Віленскай гімназіі Максім Гарэцкі, які падтрымліваў паэтычнае развіццё Н. Арсенневай, такім чынам яна мела тут свайго папулярызатара, прынамсі, у 1920-я гады. Амаль адразу пасля выхаду першага зборніка *Пад сінім небам* у Вільні, у 1927 г. ў БССР выйшла рэцэнзія Мікалая Байкова на гэтую кнігу, надрукаваная ў адным з цэнтральных часопісаў. Значыць, была магчымасць яе прачытаць. „У асобе Наталлі Арсенневай мы маем паэтку вышэйшае, так сказаць, ступені з выпрацаванай тэхнікай вершу пры ўнутранай змястоўнасці паэтычнай творчасці", адзначыў М. Байкоў (Bajkoŭ, 1927, s. 187), хоць пры гэтым і заўважаў: „Праўда, Н. Арсеннева – ня наша, савецкая паэтка. Але яна прыналежыць да беларускай літаратуры, якая, дзе б яна ні з'яўлялася, уваходзіць у агульны струмень беларускага культурнага развою нашых «рэвалюцыйных» дзён" (Bajkoŭ, 1927, s. 186).

Яўгенія Пфляўмбаўм – актыўная ўдзельніца беларускай моладзевай пісьменніцкай арганізацыі „Маладняк", адна з аўтарак (разам з Зінаідай Бандарынай і Наталляй Вішнеўскай) маладнякоўскага жаночага зборніка *Вершы* (1926). Аднак яе паэтыка выразна адрозніваецца ад мэйнстрыму, у вершах няма супрацьпастаўлення старога і новага, горада і вёскі, ухвалення новага ладу і г. д. У дачыненні да Я. Пфляўмбаўм таксама можна весці гаворку пра эстэтызацыю жыццёвых з'яў і фактаў, пра якую пісаў Ян Чыквін, разважаючы над творчасцю Наталлі Арсенневай: раннюю паэзію Яўгеніі Пфляўмбаўм цяжка аднесці да агульнай плыні „рэвалюцыйных" дзён, для яе характэрная засяроджанасць на ўнутраным свеце гераіні, вытанчаная лексіка. У той жа час малаверагодна, што на яе творчасць маглі аказаць уплыў вершы Н. Арсенневай, паколькі дадзеныя тэндэнцыі выяўляюцца ўжо ў ранніх вершах Я. Пфляўмбаўм (хоць цалкам выключыць падобную магчымасць мы, безумоўна, не можам). Аднак з паэтак Савецкай Беларусі бліжэй за ўсё да Наталлі Арсенневай стаіць, на нашую думку, менавіта Яўгенія Пфляўмбаўм, хоць М. Байкоў і пісаў, што яе вершам характэрны „аб'ектыўны лірызм", мы лічым, што гэта можа быць справядліва толькі ў дачыненні да першага агульнага зборніка *Вершы*, далей – толькі „суб'ектыўны лірызм" (Bajkoŭ, 1926, s. 150).

Ці можна гаварыць пра развіццё „лініі Багдановіча" як пра аўтарскую стратэгію ў беларускай савецкай жаночай паэзіі? Думаецца, што ў дачыненні да Я. Пфляўмбаўм – можна, тым больш, што, па-сутнасці, творчасць Я. Пфляўмбаўм міжваеннага перыяду да нядаўняга часу ніхто з літаратуразнаўцаў не разглядаў. Паэтка, хоць і была актыўнай удзельніцай „Маладняка", але ў „маладнякоўскі"

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

перыяд у яе вершах не адзначаецца „бурапеннасці", характэрнай для большасці яго ўдзельнікаў. Для паэткі краса, харство – ключавое паняцце, якое сустракаецца ў розных сінанімічных лексемах, напрыклад: „Так многа, многа год і вельмі мала песняў / аб радасці жыцця і **харстве** палёў…" (*З лістоў да брата* (Pfliaŭmbaŭm, 1926, s. 32), „Запаліўся таемнасцю жгучай прастор / І заціх у атруце **пякнотай**…" (*Вячэрнія рытмы* (Pfliaŭmbaŭm, 1927b, s. 30), „**Красу** мелодый гордых і крыштальных…" (*Гімн* (Pfliaŭmbaŭm, 1927c, s. 100), „Мне ў забыцці гэтак дзіўна і проста / Закалыхаць **харствоm** цяжар…" (*Вецер у стэпу такі малады* (Pfliaŭmbaŭm, 1927a, s. 81)) і гэдак далей, прыклады можна доўжыць. Тут яна хутчэй набліжаецца да такіх паэтаў, як Уладзімір Жылка і Ўладзімір Дубоўка, прадстаўнікоў так званага „эстэцкага" накірунку (Čykvìn, 2020a, s. 11–26).

Тым больш кідаецца ў вочы радыкальнае адрозненне вершаў Я. Пфляўмбаўм канца 1920-х – пачатку 1930-х гадоў, перыяду канца „Маладняка" і росквіту „БелАППа" (Danìl′čyk, 2021, s. 33–49). Мяняецца ці не ўсё – стыль, форма, лексіка, тэматыка, настрой. У дачыненні да гэтай аўтаркі можна весці гаворку пра таліторную эстэтыку, якой пачала падпарадкоўвацца яе творчасць. Ад унутранага свету лірычнага „я" паэтка пераходзіць да знешняй бутафорыі і асвятляе, прынамсі, у тых вершах, што былі апублікаваныя у канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг., амаль выключна з'явы і падзеі сацылістычнага будаўніцтва, што паўплывала і на фармальныя аспекты яе стылю. Аднак перыяд новай аўтарскай стратэгіі Я. Пфляўмбаўм завяршыўся даволі хутка – спачатку паэтка выходзіць замуж, пасля едзе следам за мужам у высылку. І на вельмі доўгі час перастае публікавацца.

Такім чынам, Я. Пфляўмбаўм – прыклад радыкальнай змены аўтарскай стратэгіі. Адзначым, што і ў творчасці Н. Арсенневай пасля вяртання з высылкі з Казахстана ў 1940 г. з'явіліся творы, якія ўслаўлялі савецкую рэчаіснасць, аднак абсалютна зразумела, чым было выклікана іх напісанне. У выпадку Наталлі Арсенневай сапраўдная, унутрана абумоўленая змена аўтарскай стратэгіі і камунікацыі з чытачом адбудзецца пад час Другой сусветнай вайны, калі голас аўтаркі будзе звернуты не ўнутры сябе, а вонкі і, адпаведна, да шырокіх чытацкіх масаў.

Каштоўным прыкладам для аналізу аўтарскіх стратэгій з'яўляецца творчасць Антоніі Поццы – італьянскай паэткі, якая ўвогуле не друкавалася пры жыцці. Першая кніга *Словы* (*Parole*) выйшла ўжо пасля яе смерці ў 1939 г. і спатрэбіўся пэўны час, каб яе творчасць атрымала належнае прызнанне: „…У вачах тых, хто ў дачыненні да жаночай паэтычнай прадукцыі аддаваў перавагу несумненна больш спакойным вершам Ады Негры[2] ці палкім творам Сібілы Алерама[3], наватарская паэзія Антоніі Поццы не магла быць зразумелай з-за сваёй неверагоднай арыгінальнасці. Пасля смерці і першага анталагічнага выдання яе вершаў – апублікаванага пасмяротна прыватным чынам у 1939 г. яе бацькам пад назвай *Словы*,

[2] Ада Негры [Ada Negri, 1870–1945] – італьянская паэтка.

[3] Сібіла Алерама [Sibilla Aleramo, 1876–1960] – італьянская паэтка, пісьменніца.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

яе вершы сапраўды дабразычліва ўспрымаліся рознымі крытыкамі, але хутчэй дзякуючы сваім тэматычным элементам, прынамсі знешне больш звыклым і супакойлівым (такім, як прырода, каханне, сяброўства, прага мацярынства, жаль з-за пакутаў чалавецтва) і ўвогуле з-за агульнай свежасці паэтычнай мовы" (Bernabò, 2020, s. 166). Антонія Поццы захаплялася фатаграфіяй і альпінізмам, скончыла філасофію ў міланскім універсітэце, сярод яе універсітэцкіх сяброў былі паэт Вітторыа Серэні [Vittorio Sereni, 1913−1983] і філосаф Рэма Кантоні [Remo Cantoni, 1914−1978].

Яе паэзія у некаторай ступені набліжаецца да герметызму − своеасаблівага бунта супраць прапагандысцкай рыторыкі аўтарытарнага рэжыму ў італьянскай паэзіі 30-х гадоў XX ст., але не тоесная яму. Асаблівасцю герметычнай паэзіі стала засяроджанасць на ўласным унутраным свеце, адсутнасць красамоўных рытарычных прыёмаў, імкненне перадаць яснымі словамі глыбіню пачуццяў, а таксама ўвага да сутнасных праяў быцця. Тэматыкай некаторых вершаў апошніх гадоў (увагай да праблем рэальнага жыцця) паэзія Антоніі Поццы набліжаецца і да „ламбардскай лініі" – літаратурнай плыні, якая ўзнікла ў Мілане ў канцы XIX ст. і атрымала назву, дзякуючы публікацыі аднайменнай анталогіі (*Linea Lombarda. Sei poeti*), укладзенай Лучана Анчэскі [Luciano Anceschi, 1911–1995], яшчэ адным выпускніком філасофскага факультэта міланскага ўніверсітэта, у 1952 годзе. Крытыкі адзначаюць і пэўны ўплыў на яе вершы паэтыкі нямецкага экспрэсіянізму, які, дарэчы, назіраецца і ў паэзіі Я. Пфлямбаўм.

Зразумела, што творы Антоніі Поццы не былі вядомыя ў міжваенны перыяд у Беларусі, як, уласна кажучы, і ў Італіі, акрамя вузкага кола яе сяброў-інтэлектуалаў. Паэтка належыла да прывеліяванага класу і мела куды больш шырокія магчымасці, чым звычайная італьянская дзяўчына, аднак, як адзначае Грацыэла Бернабо: „Знешняя эмансіпацыя, да якой Рабэрта Поццы штурхаў дачку праз вытанчанае прагрэсіўнае выхаванне выразна кантраставала з той сітуацыяй прыніжанасці жанчыны ў часы фашызму і з няспыннымі заклікамі да біялагічнай функцыі мацярынства, скіраванымі тады да дзяўчынак пачынаючы ад самага пяшчотнага ўзросту" (Bernabò, 2020, s. 158). Адсюль пэўная супярэчнасць паміж унутраным і знешнім, паміж пошукамі свабоды і абмежаваннямі, якія накладаліся навакольным асяроддзем.

Лірычная гераіня Антоніі Поццы таксама найперш засяроджаная на ўласным ўнутраным свеце, у якім адбіваецца прыгажосць навакольнай прыроды. Характэрным у гэтым плане з'яўляецца верш *Прыгажосць* (*Bellezza*, 1934), у якім паэтка дэкляруе сваю вернасць ідэалам „актыўнай" красы, якая дазваляе жыць і рухацца далей:

Табе аддам сябе самую,
ночы мае бяссонныя,
павольнае глытанне
неба і зорак – выпітых

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

у гарах,
брыз пяройдзеных мораў
на заклік далёкіх світанкаў...
(Россу, 2021, s. 40).

У вершах А. Поццы прырода – мора, вецер, горы – і краса знаходзяцца ў няспынным руху. Лірычная гераіня часам у захапленні назірае за навакольным светам, часам актыўна з ім узаемадзейнічае, як у вершы *Лясная песня* (*Canto selvaggio,* 1929), прычым зноў жа ў адрозненне ад вершаў беларускіх паэтак вершы А. Поццы больш экспрэсіўныя. І адзначым яшчэ адну асаблівасць – наяўнасць матыву смерці, які часта паўтараецца ў яе творах:

Я крычала радасна на заходзе сонца.
Шукала пад сіверам цыкламены:
паднялася да падножжа круглай скалы
паморшчанай і расколатай карэннем хмызоў.
(Россу, 2017).

Г. Бернабо адзначае, што ў паэзіі А. Поццы прысутнічаюць чатыры прыродныя стыхіі, чатыры касмічных элемента „зямля – урадлівая або цвёрдая зямля (асабліва таму, што прамерзла); паветра – праз выявы светлага або цёмнага неба; чыстая крынічная вада, цёмнае возера ці бязмежная марская вада; агонь, як разбуральны, але і як жыццёва важны элемент. Рысы шматтанальнай песні, якая ад аднаго верша да другога, а часам і ўнутры аднаго і таго ж тэкста вагаецца паміж лёгкай каларыстыкай, у якой пераважаюць далікатныя празрыстыя колеры, і каларыстыкай моцнай, з перавагай чырвонага, чорнага і сіняга" (Bernabò, 2017, s. 168). Колеравая экспрэсія характэрная і для Яўгеніі Пфляўмбаўм (Danìl'čyk, 2016, s. 200–205), і, думаецца, яе можна разглядаць і як агульны ўплыў нямецкага экспрэсіянізму ў тым ліку і на жаночую паэзію.

Ад беларускіх аўтарак вершы Антоніі Поццы адрозніваюцца і тэмай кахання, якая выяўляецца ў іх адкрыта і эратычна, што было нязвыкла і для тагачаснай італьянскай паэзіі. „Нават кветкі, вельмі частыя ў яе паэзіі, неўзабаве губляюць сэнс далікатных рамантычных або змрочных знакаў, яшчэ прысутных у першых спробах, каб з дапамогай розных прыёмаў – экзальтацыі колеру, пашырэння прапорцый або размяшчэння на незвычайным фоне зрабіцца смелымі вобразамі эраса, звернутага не толькі да чалавека, але і да жыцця і свету ў цэлым" (Bernabò, 2017, s. 168). Аднак і тут можна выявіць пэўныя аналогіі з беларускай паэзіяй, якія вымагаюць далейшых даследаванняў.

Як мы ўжо адзначылі вышэй, агульнай тэмай у творчасці трох аўтарак ёсць тэма паэта і паэзіі. Н. Арсеннева ў адным з ранніх вершаў, *Пад сінім небам* (1925), вызначае існаванне паэта як імкненне ў вышэйшыя сферы, у шырокі прастор да паўнаты жыцця, у тым ліку і творчага:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

Дык гэць, у неба, у край вясенні
Ад мар, што душаць у жыцці,
На белых крыллях лятуцення,
Пясняр, на слова-чар ляці
(Arsenneva, 2002b, s. 27).

Але ўжо ў вершы *Маладым паэтам* (1934) лірычная гераіня задумваецца над роляй творцы. У гэтым творы „прачытваецца" выснова, што аўтарская стратэгія паэткі – адрозная ад стратэгій маладых паэтаў, але для яе, напэўна, застаецца адзіна правільнай:

Я, як жоўтая восень, стаю над жыццём
і гляджу на яго, хоць наўкола – змаганне.
Мае вершы – над сонным балотам трысцё,
мгла сівая асенняга рання
(Arsenneva, 2002a, s. 90).

Тэма паэта і паэзіі праходзіць праз усю творчасць Н. Арсенневай і, хоць і трансфармуецца з часам, але сутнасна застаецца нязменнай – гэта вернасць свайму пакліканню і сваёй аўтарскай стратэгіі, як, на прыклад, у вершы *Часіны творчасці* (1935):

Нялёгка йсці праз нетры слоўныя,
якія йлгуць, тварыць нязнанае,
і рытмы праставаць няроўныя,
і рыфмы уздзіраць дзірванныя,
шукаць мэтафары разменнае
у думках – жоўтых пыльных хронікаў,
і ў словы выліваць штодзённыя
глухія гутаркі сасоннікаў…
(Arsenneva, 2002c, s. 101).

Гэта адчуў і заўважыў К. Бруевіч: „З пасярод многіх мастацкіх прыёмаў звяртае яна асаблівую ўвагу на паэтыцкае апрацаванне і ўпарадкаванне языковага матарыялу, надаючы яму заўсёды выразныя артыстычныя функцыі. Рэзультат з гэтага такі, што, калі ўважна ўслухацца з яе вершы, то ня знойдзем мы ў іх амаль ніводнае строфкі, якая б так ці іначай не прамаўляла да нашага пачуцця і не выклікала адпаведнага настрою" (Bruevìč, 1937, s. 34).

У выпадку Я. Пфляўмбаўм змена мастацкай стратэгіі закранула і тэму паэтычнай творчасці, адлюстраваную ў яе творах. У вершы *Паэце* (1928) Я. Пфляўмбаўм аддае перавагу ўзаемадзеянню творцы з сіламі прыроды, у выніку якога рэалізуецца інтэнцыя аўтара „абуджаць у водзыўках рэшту светлых сноў":

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

Вочы заяскравілі…
смутак пераможаны,
ліраю пакорлівай
разаб'еш ты лёд:
песня пераліўная
тузе варожая
абаўе у водзыўках
пунсавейны ўсход
(Pfliaŭmbaŭm, 1928, s. 98).

Аднак у „белаппаўскі" перыяд роля паэта змяняецца, на першы план выходзіць яго сацыльна-прапагандысцкая функцыя, як, на прыклад, у вершы *1-е мая* (1929). Як бачым, вершы блізкія па часе, але розныя па сутнасці:

Кожны з нас –
рабочы паэт:
Сцяг чырвоны
парыўна ўздымае
(Pfliaŭmbaŭm, 1929).

Антонія Поццы неаднаразова звяртаецца да тэмы паэта і паэзіі. Для яе лірычнай гераіні творчасць застаецца ўнутрана абумоўленай неабходнасцю, як, на прыклад, у вершы *Лёс* (*Un destino*, 1935):

І калі ніякія дзверы
не адчыняюцца ад тваіх намаганняў,
калі вяртаецца
табе на кожным кроку цяжар твайго твару,
калі належыць табе,
гэтая, мацнейшая за боль,
радасць самой ісці далей
у празрыстай пустыні тваіх гор,

тады прызнаеш,
што ты паэт
(Россу, 2012a, s. 114).

Творца ў інтэрпрэтацыі італьянскай паэткі – не старонні назіральнік, ён актыўна рэагуе на навакольны свет. Гэта падкрэслівае Луіза Рынальдзі, асабліва ў дачыненні да позніх вершаў А. Поццы: „<…> цеплыня, адчуванне цела і эмоцый, моцны экспрэсіянізм з інтэнсіўным храматызмам на службе

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

элінскага *charis*[4] (якія варта разумець не столькі як жаль да сябе, бясконцы боль і пакуту Мантале[5], колькі як чалавечы ўдзел у жыцці ўсіх стварэнняў, асабліва сціплых). Гэты «выкрывальны» экспрэсіянізм... у паэзіі Поццы перасякаецца з «ламбардскай лініяй»" (Rinaldi, 2016). Эмацыйная ўзаемасувязь італьянскай паэткі і яе творчасці раскрываецца ў такім вершы, як *Малітва да паэзіі* (*Preghiera alla poesia*, 1934):

> Паэзія, дары сябе толькі таму,
> хто расчуленымі вачыма
> шукае сваю душу,
> о, зрабі мяне вартай цябе
> і ахоўвай мяне, паэзія
> (Poccy, 2012b, s. 115).

Аўтарскую стратэгію Антоніі Поццы можна вызначыць як інтраспекцыю. Прынамсі першапачаткова яна не прадугледжвала выхад да шырокага чытача, і пры жыцці паэткі гэтага так і не адбылося. Аднак у позніх вершах ужо прысутнічаюць, хай імпліцытна, водгукі гістарычных падзей і атмасферы, што панавала ў той час у краіне, накладзеныя на асабістыя праблемы, хоць „<…> у цёмнай атмасферы Італіі напярэдадні Другой сусветнай вайны, у такім асяродку, не звязаным з фашысцкім рэжымам, як група Банфі[6], было лёгка ўбачыць простую персанальную праблему ў экзістэнцыйнай драме Антоніі Поццы, для якой у сапраўднасці свет і „я" не былі абсалютна супрацьпастаўлены, нават калі адносіны паміж гэтымі двума палюсамі пражываліся ёю не так, як іншымі" (Bernabò, 2020, s. 160). І хоць Антонія Поццы не публікавала вершаў, але гэта, бадай, найбольш цэльная паэтка з трох разгледжаных з пункту гледжання аўтарскіх стратэгій і мастацкіх сродкаў.

У адрозненні ад італьянскай аўтаркі Наталля Арсеннева ад пачатку творчага шляху актыўна друкавалася, аднак дыстанцыявалася ад сацыяльных матываў (ва ўмовах Заходняй Беларусі гаворка ідзе найперш пра нацыянальную барацьбу), доўгі час існавала ў іншамоўнай прасторы, спасцігаючы ўнутраны свет праз змены навакольнай прыроды, у паэзіі рэдка звярталася да свету іншых людзей. Ян Чыквін адзначае: „Яе паэзія ў гэты «польскі» (1922–1939) перыяд тэматычна звужаецца да сферы прыватнага, камернага лірычнага «я», якое, аднак, шторaз экстрапаліруе сябе ў сферу прыроды ды ў перспектыву вечнасці…" (Čykvìn, 2003, s. 774). Пералом адбыўся ўжо па-за межамі азначанага перыяду – спачатку

[4] Charis (грэц. Χάρις) – харaство.

[5] Эўджэніа Мантале [Eugenio Montale, 1896–1981] – італьянскі паэт, празаік, літаратурны крытык. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі (1975).

[6] Антоніа Банфі [Antonio Banfi, 1886–1957] – філосаф, палітык, выкладчык міланскага ўніверсітэта і кіраўнік дыпломнай працы Антоніі Поццы, прысвечанай творчасці Флабэра.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

вымушаныя вершы пра Сталіна, а з пачаткам Другой сусветнай вайны – зварот да народнай бяды. Менавіта ў ваенны перыяд адбылося тое, што ў свой час прадказаў М. Байкоў: „Такім чынам, мы бачым Арсенневу на тым самым шляху, якім прайшлі і іншыя нашыя выдатныя песняры. Якія могуць быць развіленні гэтага шляху? Ад прыроды – просты шлях да чалавека” (Bajkoŭ, 1927, s. 194).

Аўтарская стратэгія Яўгеніі Пфляўмбаўм да пэўнага моманту не прадугледжвала актыўнага водгука на сацыяльны заказ часу. Радыкальная змена аўтарскай стратэгіі была выкліканая, напэўна, не толькі знешнімі прычынамі, хоць цяжка паверыць у верагоднасць такога хуткага ўнутранага пераўтварэння. З аднаго боку, „белаппаўскія” вершы сведчаць пра шырыню творчага дыяпазону паэткі, з другога – пра пэўную гнуткасць мастацкіх прыярытэтаў.

Бадай, агульнае ў аўтарскіх стратэгіях паэтычнай творчасці трох названых аўтарак – дыстанцыянаванне. Па-першае – ад сацыяльнага заказа свайго часу (у Я. Пфляўмбаўм да пэўнага моманту), па-другое – ад непасрэднага актыўнага ўзаемадзеяння з творчым асяроддзем і чытачом (Н. Арсеннева, А. Поццы, пасля 1931 года – і Я. Пфляўмбаўм). Немалаважную ролю адыгрываюць і творчыя амбіцыі аўтарак (або іх адсутнасць), аднак у разгледзеных намі выпадках амбіцыі не выўляюцца экспліцытна.

Хоць паэтычны вопыт трох паэтак несумненна розны, але іх першапачатковыя аўтарскія стратэгіі былі скіраваныя на выяўленне ўнутранага стану лірычнай гераіні, часта праз з’явы навакольнай прыроды. Наталля Арсеннева захоўвае гэты статус кво да 1939 года, далей у сувязі з сацыяльна-палітычнымі зменамі, якія самым непасрэдным чынам закранулі яе жыццё, адбываецца выхад за межы ўнутранага свету ў навакольны; паэзія Антоніі Поццы пэўны час быццам жыве па-за межамі таталітарнага грамадства, але ў позніх вершах пачынаюць ускосна гучаць матывы збліжэння з людзьмі, прычым з людзьмі з рабочага асяроддзя; Яўгенія Пфляўмбаўм аддавала перавагу эстэтыцы хараства ў „маладнякоўскі” перыяд (1925–1928), пасля з уступленнем у БелАПП адбылася радыкальная змена аўтарскай стратэгіі і тэматычна, і стылістычна, што абумовіла выкарыстанне іншых мастацкіх сродкаў і практычнае знікненне лірычнага „я” замененага на „кожны з нас”, „мы”, „ты”.

Мы закранулі толькі некаторыя моманты, звязаныя з гэтай цікавай і перспектыўнай тэмай. Аўтарскія стратэгіі паэтычнай творчасці – з’ява, безумоўна, не столькі сацыяльная, колькі ўнутрана абумоўленая талентам, жыццёвым і мастацкім вопытам, светапоглядам і г. д., пры гэтым не з’яўляецца чымсьці стабільным і прадвызначаным, можа змяняцца на працягу творчай актыўнасці аўтара пад уплывам у тым ліку і знешніх, так званых, экстралінгвістычных фактараў.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Arsenneva, Natallâ. (2002). *Vybranae*. Mìnsk: Knìgazbor. [Арсеннева, Наталля. (2002). *Выбранае*. Мінск: Кнігазбор].

Bajkoŭ, Mìkalaj. (1926). Z. Bandaryna, N. Višneŭskaâ, Â. Pflâŭmbaŭm. Veršy. *Maladnâk*, 3, s. 149–150. [Байкоў, Мікалай. (1926). З. Бандарына, Н. Вішнеўская, Я. Пфляўмбаўм. Вершы. *Маладняк*, 3, с. 149–150].

Bajkoŭ, Mìkalaj. (1927). Ab tvorčascì Natallì Arsennevaj. *Polymâ*, 8, s. 186–194. [Байкоў, Мікалай. (1927). Аб творчасці Наталлі Арсенневай. *Полымя*, 8, s. 186–194].

Bernabò, Graziella. (2020). Antonia Pozzi e la poesia del corpo, *Dialogoi. Rivista di studi comparatistici*, 7, s. 155–172.

Bruevìč, K. (1937). Na paètyčnaj vyšynì (Ab tvorčascì Natallì Arsennevaj). *Kalosse*, 1, s. 31–37. [Бруевіч, К. (1937). На паэтычнай вышыні (Аб творчасці Наталлі Арсенневай). Калоссе", 1, с. 31–37].

Čykvìn, Ân. (2003). Natallâ Arsenneva. U: Uladzìmìr Gnìlamëdaŭ, Scâpan Laŭšuk (rèd). *Gìstoryâ belaruskaj lìtaratury XX stagoddzâ* u 4 t. T. 4. Kn. 2: *1986–2000* (s. 772–787). Mìnsk: Belaruskaâ navuka [Чыквін, Ян. (2003). Наталля Арсеннева. У: Уладзімір Гніламёдаў, Сцяпан Лаўшук (рэд). *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя* у 4 т. Т. 4. Кн. 2: *1986–2000* (с. 772–787). Мінск: Беларуская навука].

Čykvìn, Ân. (2020a). Lâ vytokaŭ ìdèjna-èstètyčnaga suprac′staânnâ ŭ belaruskaj paèzìi 20–30-h gadoŭ. U: Ân Čykvìn. *Ìmëny. Tvory. Kantèkst* (s. 11–26). Belastok: BLA „Belaveža". [Чыквін, Ян. (2020a). *Ля вытокаў ідэйна-эстэтычнага супрацьстаяння ў беларускай паэзіі 20–30-х гадоў*. У: Ян Чыквін. *Імёны. Творы. Кантэкст* (с. 11–26). Беласток: БЛА „Белавежа"].

Čykvìn, Ân. (2020b). Narod âk aksìâlagìčnaâ prablema ŭ tvorčascì Natallì Arsennevaj. U: Ân Čykvìn. *Ìmëny. Tvory. Kantèkst* (s. 27–42). Belastok: BLA „Belaveža". [Чыквін, Ян. (2020b). Народ як аксіялагічная праблема ў творчасці Наталлі Арсенневай. У: Ян Чыквін. *Імёны. Творы. Кантэкст* (с. 27–42). Беласток: БЛА „Белавежа"].

Danìl′čyk, Aksana. (2016). Èstètyka paèzìi Â. Pflâŭmbaŭm 1920–1930-h gadoŭ. U: Alena Mankevìč (rèd.). *Belaruskaâ lìtaratura ŭ kul'turnaj prastory sučasnaga gramadstva: matèryâly Mìžnarodnaj navukovaj kanferèncyì da 120-goddzâ z dnâ naradžènnâ Kandrata Krapìvy (Mìnsk, 3–4 sakavìka 2016 g.)*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Данільчык, Аксана. (2016). Эстэтыка паэзіі Я. Пфляўмбаўм 1920–1930-х гадоў. У: Алена Манкевіч (рэд.). *Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства*: *матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі да 120-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы (Мінск, 3–4 сакавіка 2016 г.)*. Мінск: Беларуская навука].

Danìl′čyk, Aksana. (2021). Tatalìtarnaâ èstètyka ŭ belaruskaj lìtaratury: na prykladze tvorčascì Âŭgenìi Pflâŭmbaŭm. *Białorutenistyka Białostocka*, 13, s. 33–50. [Данільчык, Аксана. (2021). Таталітарная эстэтыка ў беларускай літаратуры: на прыкладзе творчасці Яўгеніі Пфляўмбаўм. *Białorutenistyka Białostocka*, 13, с. 33–50].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

Gûnter, Xans; Dobrenko, Evgenij (red.). (2000). *Socrealističeskij kanon*. Sankt-Peterburg: Akademičeskij projekt. [Гюнтер, Ханс; Добренко, Евгений (ред.). (2000). *Соцреалистический канон*. Санкт-Петербург: Академический проект].

Luckievič, Anton. (2006). *Vybranyja tvory: prabliemy kuĺtury, litaratury i mastactva*. Minsk: Knihazbor. [Луцкевіч, Антон. (2006). *Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва*. Мінск: Кнігазбор].

Pfliaŭmbaŭm, Jaŭhienija. (1926). Z listoŭ da brata. *Maladniak*, 10, s. 32. [Пфляўмбаўм, Яўгенія. (1926). З лістоў да брата. *Маладняк*, 10, с. 32].

Pfliaŭmbaŭm, Jaŭhienija. (1927a). Viecier u stepu taki malady. *Polymia*, 6, s. 81. [Пфляўмбаўм, Яўгенія. (1927a). Вецер у стэпу такі малады. *Полымя*, 6, с. 81].

Pfliaŭmbaŭm, Jaŭhienija. (1927b). Viačernija rytmy. *Tvorčyja budni*, 5, s. 30. [Пфляўмбаўм, Яўгенія. (1927b). Вячэрнія рытмы. *Творчыя будні*, 5, с. 30].

Pfliaŭmbaŭm, Jaŭhienija. (1927c). Himn. *Polymia*, 4, s. 100. [Пфляўмбаўм, Яўгенія. (1927c). Гімн. *Полымя*, 4, с. 100].

Pfliaŭmbaŭm, Jaŭhienija. (1928). Paecie. *Polymia*, 2, c. 98. [Пфляўмбаўм, Яўгенія. (1928). Паэце. *Полымя*, 2, с. 98].

Pfliaŭmbaŭm, Jaŭhienija. (1929). 1-ha maja. *Zviazda*, 1 maja. [Пфляўмбаўм, Яўгенія. (1929). 1-га мая. *Звязда*, 1 мая].

Poccy, Antonija. (2012a). Lios. *Vierasień*, 6, s. 114. [Поццы, Антонія. (2012a). Лёс. *Верасень*, 6, с. 114].

Poccy, Antonija. (2012b). Malitva da paezii. *Vierasień*. 6, c. 115. [Поццы, Антонія. (2012b). Малітва да паэзіі. *Верасень*, 6, с. 115].

Poccy, Antonija. (2021). Pryhažosć. *Naša viera*, 4, s. 40. [Поццы, Антонія. (2021). Прыгажосць. *Наша вера*, 4, с. 40].

Pocy, Antonija. (2017). *Liasnaja piesnia*. [Поцы, Антонія. *Лясная песня*]. Taken from: http://prajdzisvet.org/texts/kits/paxavanne-bez-smutku.html (accessed: 22.03.2022).

Prozorov, Valerij. (2021). Ob avtorskih strategiâh v literature. *Izvestiâ Saratovskogo universiteta. Novaâ seriâ. Seriâ: Filologiâ. Žurnalistika*, 21(2), s. 180–185. [Прозоров, Валерий. (2021). Об авторских стратегиях в литературе. *Известия Саратовского университета. Новая серия. Серия: Филология. Журналистика*, 21(2), с. 180–185].

Rinaldi, Luisa. (2016). *Poesia che rimani: una lettura di Antonia Pozzi.* Pobrano z: https://www.tropismi.it/2016/03/25/poesia-che-rimani-una-lettura-di-antonia-pozzi/, (dostęp: 20.03.2022).

Spinazzè, Sabrina. (2001). *Donne e attività artistica durante il Ventennio*. W: Sabrina Spinazzè, Laura Iamurri (red.). L'arte delle donne nell'Italia del Novecento, (s. 121–136). Milano: Booklet.

Ûrina, Natal′â. (2020). Avtorskie strategii v hudožestvennom tvorčestve V. S. Solov′eva. *Filologičeskie nauki. Voprosy teorii i praktiki*, 13(6), s. 74–79. [Юрина, Наталья. (2020). Авторские стратегии в художественном творчестве В. С. Соловьева. *Филологические науки. Вопросы теории и практики*, 13(6), с. 74–79].

SUBMITTED: 7.06.2022
ACCEPTED: 10.10.2022
PUBLISHED ONLINE: 22.12.2022

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 13/09/2026 07:13:46

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Aksana Danilchyk / Аксана Данільчык – Białoruś, Mińsk, badacz niezależny; dr; spec.: literaturoznawstwo; zainteresowania naukowe: białoruska literatura XX wieku, włosko-białoruskie związki literackie, przekład artystyczny.

Adres: пр. Ракасоўскага, 113–52, Мінск, 220085, Беларусь

Wybrane publikacje:

1. Данільчык, Аксана. (2006). Рэцэпцыя Дантэ ў беларускай літаратуры XIX–XX стст. (у славянскім кантэксце). У: Уладзімір Мархель (рэд.). *Беларуская літаратура ў кантэксце славянскіх літаратур XIX–XX стст.* (с.166–235). Мінск: Беларуская навука.
2. Данільчык, Аксана. (2008). Італьянскі рамантызм і патрыятычныя матывы беларускай літаратуры. У: Уладзімір Мархель (рэд.). *Еўрапейскі рамантызм і беларуская літаратура XIX–XX стст*. (с. 59–122). Мінск: Беларуская навука.
3. Данільчык, Аксана. (2015). Інтэрпрэтацыя жанра філасофскай паэзіі ў Італіі канца XIX ст. *Веснік БДУ*, 3, с. 5–8.
4. Данільчык, Аксана. (2016). Беларуска-італьянскія літаратурныя сувязі XIX–XX стст.: асноўныя напрамкі даследавання. У: Сяргей Гаранін, Ірына Ялынцава (рэд.). *Беларуска-італьянскае культурнае ўзаемадзеянне і праблемы захавання нацыянальнай ідэнтычнасці: гістарычны вопыт і сучасныя праблемы* (с. 210–223). Мінск: Беларуская навука.
5. Данільчык, Аксана. (2017). Крытыка і апалагетыка цывілізацыі ў беларускай літаратуры 20–30-х гадоў XX стагоддзя. *Białorutenistyka Białostocka*, 9, с. 463–475.